Вабішчэвіч Т.І. (Мінск)

«Вершы не для народа»?: некаторыя аспекты рэцэпцыі лірыкі Максіма Багдановіча беларускім чытачом пачатку XX стагоддзя

У камунікатыўна-рэцэптыўнай гісторыі беларускага мастацкага слова XX ст. постаць М. Багдановіча займае асаблівае месца: у дачыненні да гэтага творцы «праблема чытача» заўжды стаяла надзвычай востра. Ад самага прыходу ў літаратуру чытацкая арыентаванасць паэтавых тэкстаў была прадметам пастаянных спрэчак і дыскусій. Усё пачалося з вядомага па ўспамінах В. Ластоўскага «канфлікту інтэрпрэтацый», што ўзнік на пачатку 1909 г. у рэдакцыі «Нашай нівы» ў сувязі з дасланымі маладым аўтарам вершамі міфалагічна-фальклорнай тэматыкі. Ядвігін Ш. «ахрысціў» тады Багдановічавы паэтычныя спробы «дэкадэншчынай» і, падкрэслім гэту фармулёўку, «вершамі не для народа» [4, с. 192, 193]. З думкай Ядвігіна Ш. пагадзіліся чальцы «верхняй» палаты рэдакцыі (браты Іван і Антон Луцкевічы, Аляксандр Уласаў, Вітаўт Чыж, Язэп Манькоўскі), у выніку чаго «сшытачкі» з творамі М. Багдановіча не пайшлі ў друк, а былі адпраўлены ў рэдакцыйны архіў. Мастацкую вартаснасць Багдановічавых вершаў і іх актуальнасць для дэмакратычнага нацыянальна-адраджэнскага руху беларусаў здолеў праз пэўны час давесці «нашаніўцам» Сяргей Палуян (яго падтрымалі В. Ластоўскі і Я. Купала, а з «верхнепалатнікаў» першым – Чыж), і прызнаныя раней «ненароднымі» (а значыць, «непатрэбнымі» і ў нейкай ступені нават «шкоднымі» для «народацэнтрычнай» беларускай літаратуры) тэксты ў рэшце рэшт атрымалі права на выхад да чытача.

Значна пазней, ужо ў другой палове 1990-х гг., І. Навуменка ў кнізе «Максім Багдановіч» актуалізаваў меркаванне Багдановічавых апанентаў, падкрэсліўшы, што Ядвігін Ш. а следам за ім А. Паўловіч і У. Галубок (таксама згаданыя В. Ластоўскім), «не так ужо і глыбока памыляліся» [6, с. 11], калі называлі тэксты лірыка-пачаткоўца, будучага класіка нацыянальнай літаратуры, «вершамі не для народа». Згадка пра «не-для-народнасць» твораў М. Багдановіча (адваротным бокам чаго з'яўлялася іх «кніжнасць», «інтэлігентнасць», «высокая» літаратурнасць) была для І. Навуменкі спосабам падкрэсліць непадобнасць маладога мастака-наватара да іншых «нашаніўскіх» аўтараў, у першую чаргу – да Я. Купалы і Я. Коласа.

Пры характарыстыцы лірыкі М. Багдановіча як «не-для-народнай» і «нашаніўскі» сучаснік паэта, і літаратуразнаўца канца XX ст. кіраваліся найперш асабістай эстэтычнай інтуіцыяй і «штодзённым» жыццёвым вопытам, а не вынікамі аб'ектыўных навуковых назіранняў над спецыфікай успрымання Багдановічавых твораў «народным» беларускім чытачом. Падаецца, даўно наспела пара, каб верыфікаваць падобныя інтуітыўныя меркаванні. Для дасягнення гэтай мэты ў першую чаргу неабходна на аснове спецыяльна сабраных фактаграфічных дадзеных ацаніць ступень распаўсюджанасці Багдановічавай творчасці сярод масавага чытача пачатку XX ст. і, параўноўваючы «паказчыкі» М. Багдановіча з адпаведнымі «паказчыкамі» іншых песняроў-адраджэнцаў, прасачыць асаблівасці функцыянавання паэтавай лірыкі ў айчынным чытацкім асяродку «нашаніўскага» перыяду. Каштоўныя, да сённяшняга дня яшчэ слаба задзейнічаныя ў літаратуразнаўчым дыскурсе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

матэрыялы адносна цыркуляцыі беларускіх паэтычных тэкстаў у колах тагачасных «шараговых» рэцыпіентаў прапаноўвае сама «Наша ніва».

Для абранага кірунку аналітыкі вельмі істотным, калі не вызначальным, з'яўляецца такі рэцэптыўна-камунікатыўны параметр, як веданне твораў пэўнага аўтара непасрэдна «ў народзе». «Нашаніўскія» публікацыі сведчаць, што найбольшае народнае прызнанне атрымалі на пачатку XX ст. вершы Я. Купалы і А. Паўловіча. Побач з імёнамі гэтых двух паэтаў – бясспрэчных лідараў у катэгорыі «народная сімпатыя» – можна паставіць таксама імёны Ф. Багушэвіча і Я. Коласа. Менавіта творы названых аўтараў найбольш адпавядалі гарызонту чаканняў масавага (пераважна «мужыцкага») беларускага рэцыпіента і выклікалі ў вяскоўцаў сапраўды моцную эстэтычную рэакцыю (гл., напр.: [11]). На старонках газеты сустракаюцца і вельмі «сімптаматычныя» ў аспекце рэцэпцыі беларускай паэзіі масавым чытачом звесткі пра тое, што Купалавы, Паўловічавы і Коласавы вершы ахвотна завучваліся на памяць і дэкламаваліся як дзятвою, так і дарослымі сялянамі-беларусамі [9], [10]. У той жа час фактаў пра веданне «ў народзе» тых ці іншых вершаў М. Багдановіча публікацыі «Нашай нівы» не адлюстроўваюць. Безумоўна, на падставе адсутнасці такіх звестак у адной асобна вылучанай газеце неправамерна цалкам адмаўляць увагу да Багдановічавых твораў з боку вясковых чытачоў-шарагоўцаў, аднак, малая ступень зацікаўленасці масавага рэцыпіента мастацкай дзейнасцю М. Багдановіча выяўляецца даволі выразна.

Цікавыя дадзеныя для аналізу асаблівасцей функцыянавання Багдановічавай творчасці ў колах беларускай чытацкай аўдыторыі пачатку XX ст. прадстаўляюць «нашаніўскія» публікацыі, якія асвятляюць тагачасныя адраджэнскія культурна-масавыя мерапрыемствы. Так, у 1910–1913 гг. у Вільні, Пецярбургу, Полацку, Гродна, Дзісне, Клецку, Слуцку і іншых гарадах і мястэчках прайшоў шэраг буйных беларускіх «вечарынак», разлічаных на самую шырокую аўдыторыю. Як асобныя нумары праграмы або ў якасці «перапынкаў» паміж дзеямі п'есы са сцэны ў выкананні артыстаў гучалі вершы беларускіх песняроў. Бясспрэчнымі ўлюбёнцамі беларускай публікі пачатку XX ст. былі ўсе тыя ж адзначаныя вышэй Я. Купала – «душа і язык прабудзіўшагася да новага жыцця народа» (У. Самойла) [2, с. 580] – і А. Паўловіч – паэт-гумарыст, творы якога нязменна падкуплялі масавага рэцыпіента дасціпнасцю, пазітыўным пафасам, «блізкасцю» побытавага зместу. Без вершаў гэтых аўтараў не абыходзілася амаль ніводнай пастаноўкі (афішы і нататкі-публікацыі з адпаведнымі дадзенымі гл.: [7] і інш.). Рэпертуар прачытаных са сцэны ў 1910-я гг. твораў Я. Купалы толькі паводле звестак «Нашай нівы» можа быць акрэслены блізу як двума дзясяткамі назваў. Вельмі значнае месца ў праграме масавых «вечарынак» займалі і творы А. Паўловіча: «нашаніўскія» публікацыі зафіксавалі каля дзесяці іх назваў. У параўнанні з Купалавымі і Паўловічавымі дасягненнямі рэпрэзентацыя на адраджэнскай сцэне творчасці астатніх беларускіх паэтаў падаецца даволі сціплай. Так, згодна з дадзенымі «Нашай нівы», з творчасці Ф. Багушэвіча, Цёткі, А. Гаруна і іншых аўтараў XIX – пачатку XX ст. (нават Я. Коласа) для масавай аўдыторыі дэкламавалася ў 1910-я гг., як правіла, усяго па два – тры вершы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Яшчэ больш сумна на гэтым фоне выглядае сітуацыя з М. Багдановічам. Акрамя таго, што ў газетных абвестках і паведамленнях пра масавыя тэатральныя імпрэзы прозвішча паэта сустракаецца рэдка, яго мастацкія напрацоўкі прадстаўлены для наведвальнікаў «вечарынак» вельмі вузка: ва ўсіх згаданых «Нашай нівай» выпадках у праграму мерапрыемстваў уваходзіць адзін верш – «Краю мой родны! Як выкляты Богам…» (гл.: [1], [5], [8]).

З аднаго боку, невыпадкова, што з усёй шматстайнай Багдановічавай творчасці арганізатары імпрэз абралі для мастацкага чытання якраз гэты, блізкі па агульнай танальнасці да адраджэнскай лірыкі Я. Купалы і Я. Коласа верш. Востранадзённы, сугучны патрыятычным настроям «заангажаванай» публікі і абуджальна-прасвятляльны ў дачыненні да «нацыянальна-несвядомых» слухачоў, «Краю мой родны! Як выкляты Богам…» па-сапраўднаму кранаў сэрцы прысутных, уваходзіў у рэзананс з агульным настроем грамады. Разам з тым такі выбар (а складальнікі праграмы, без сумневу, улічвалі рэцэптыўна-эстэтычныя чаканні публікі, бралі пад увагу прыхільнасці артыстаў-дэкламатараў і ўласныя чытацкія густы) дазваляе зрабіць выснову, што М. Багдановіч быў прызнаны масавым рэцыпіентам-сучаснікам найперш у іпастасі песняра-адраджэнца, змагара за лепшую долю скрыўджанага народа.

Кароткі аналіз матэрыялаў «Нашай нівы» на гісторыі функцыянавання і рэцэпцыі беларускіх паэтычных твораў у асяроддзі масавага чытача 1900–1910-х гг. пацвярджае інтуітыўна заўважаную Ядвігіным Ш. (а пазней неаднаразова артыкуляваную іншымі крытыкамі і даследчыкамі) неадпаведнасць М. Багдановіча-паэта «чытацкім» рэаліям «нашаніўскай» пары. На пачатку XX ст. распаўсюджанасць і засвоенасць Багдановічавых тэкстаў сярод «шараговага» рэцыпіента – найчасцей «сялянскага» (галоўнага рэпрэзентанта «нацыянальнага чытача») – сапраўды, як і меркаваў Ядвігін Ш., была нязначнай. Але пытанне пра М. Багдановіча як паэта «не для народа» на гэтым не вычэрпваецца: наадварот, узнікае неабходнасць задумацца над самім паняццем «народ», над яго разуменнем рознымі прадстаўнікамі беларускага адраджэнскага руху пачатку XX ст.

Відавочна, што многія «нашаніўцы», асабліва тыя, хто адмоўна паставіўся да паэтычных шуканняў М. Багдановіча ў галіне формы і зместу беларускага верша, перанялі сваё разуменне народа ад польскіх і расійскіх народнікаў XIX ст. Рамкі паняцця «народ» былі для іх строга абмежаваныя і ўключалі толькі ніжэйшыя, малаадукаваныя сацыяльныя класы, у першую чаргу – сялянства; інтэлігенцыя ж, згодна з народніцкай дактрынай, мусіла адмовіцца ад уласных жаданняў і прыярытэтаў і цалкам прысвяціць сябе «народу»: пераняць народныя інтарэсы, вывучыць народныя патрэбы і прыкласці ўсе намаганні, каб «сплаціць доўг» сваім «гаротным братам» – паказаць шлях да прасветы, культуры і дабрабыту. На пачатку XX ст. запазычаная з XIX ст. канцэпцыя народніцтва пры ўсёй яе неабвержнай гуманістычнасці і высокім дэмакратызме аказвалася занадта вузкай для паспяховага разгортвання працэсу беларускага нацыятварэння і патрабавала істотнага абнаўлення. У адрозненне ад сваіх крытыкаў-народнікаў, М Багдановіч якраз дэманстраваў творчыя падыходы, у рамках якіх паняцце «народ» пашыралася і на інтэлігентныя, «высокія» слаі грамадства. Тым самым

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пракладалася дарога ў будучыню – туды, дзе дзякуючы агульнадаступнасці асветы знікне рэзкі падзел на малапісьменных і высокаадукаваных, а ўсе беларусы незалежна ад сацыяльнага статусу з'яднаюцца ў нацыю-народ на аснове агульнасці культуры, мовы, гістарычнай спадчыны і ідэйна-каштоўнасных арыентацый.

Сапраўды, сёння з гістарычнай адлегласці відавочна: Багдановічава мастацкая праца была праграмна скіравана ў будучыню, арыентавана на новага для Беларусі «высокага», інтэлігентнага чытача, «думаючае грамадзянства» (В. Ластоўскі). Факты пераканаўча засведчылі, што на пачатку XX ст. чытацкая аўдыторыя М. Багдановіча аб'ектыўна была вузейшай, чым у іншых вядучых аўтараў-«нашаніўцаў» («нестандартнага» паэта так і не змаглі да канца прыняць інтэлігенты-народнікі, а тагачасны «вясковы» рэцыпіент не быў яшчэ здольны адэкватна ацаніць, а значыць, і палюбіць такія мастацкія тэксты). Затое магчымасці для пашырэння кола Багдановічавых прыхільнікаў у будучыні аказаліся куды большымі, чым у многіх паэтавых сучаснікаў – нездарма даследчыкі канца XX ст. падкрэсліваюць, што сённяшняму масаваму чытачу «інтэлектуал», «эстэт» і «індывідуаліст» М. Багдановіч значна бліжэй, чым чытачу сваёй эпохі (гл., напр.: [3, с. 84] і інш.). Духоўны і інтэлектуальна-мастацкі патэнцыял спадчыны паэта па-сапраўднаму выявіўся (і працягвае выяўляцца) у «вялікім» часе.

Для паўнавартаснага развіцця маладой нацыянальнай літаратуры і культуры неацэннае значэнне меў той факт, што «інтэлігенцкая» скіраванасць Багдановічавай лірыкі пасля працяглых спрэчак і абмеркаванняў у рэшце рэшт была легітымізаваная адраджэнцамі-«нашаніўцамі». Да ідэйных кіраўнікоў адраджэння прыйшло разуменне, што яскрава рэпрэзентаваны Багдановічам універсальны ў рэцэптыўна-камунікатыўных адносінах высокамастацкі шлях развіцця адкрывае значна больш шырокія перспектывы для нацыянальна-культурнага росту, чым ранейшы вузка-народніцкі. На мяжы 1900–1910-х гг. шмат у чым дзякуючы рэцэдэнту М. Багдановіча – паэта «не для народа» – у беларускім адраджэнскім коле адбыўся зрух ва ўяўленнях пра беларусаў як народ і нацыю, пра «ідэальны» сацыяльна-культурны ўзровень нацыянальнага грамадства, пра гарызонты беларускага культура- і нацыябудаўніцтва. Нацыянальны «высокі» («інтэлігентны», «кампетэнтны») чытач як масавая, сапраўды ўплывовая рэцэптыўная група ў тыя гады яшчэ толькі пачынаў фарміравацца, але паняцце «народ» паступова вызвалялася ад «нізкіх», «простанародных» канатацый і напаўнялася новым, высокім сэнсам, адпаведным патрабаванням XX ст. і еўрапейскай сучаснасці.

Літаратура

1. Беларускі тэатр : [З Беларусі і Літвы] // Наша ніва. – 1910. – 27 крас. (№ 22). – С. 345.
2. Вл. С. «Адвечная песьня» Янкі Купалы / Вл. С. // Наша ніва. – 1910. – 16 верас. (№ 38). – С. 580–583.
3. Кабаковіч, А. Пасеянае ўзыдзе : вершы, пер., літ.-крыт. арт. / А. Кабаковіч. – Мінск, 1991.
4. Ластоўскі, В. Выбраныя творы / В. Ластоўскі. – Мінск, 1997.
5. М. Давідгарадок, Мінск. губ. Мозырск. пав. : [З Беларусі і Літвы] // Наша ніва. – 1911. – 16 чэрв. (№ 24). – С. 315.
6. Навуменка, І. Максім Багдановіч / І. Навуменка. – Мінск, 1997.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

7. Наша ніва. – 1910. – 23 верас. (№ 39); Наша ніва. – 1911. – 16 чэрв. (№ 24); Наша ніва. – 1911. – 1 снеж. (№ 47–48); Наша ніва. – 1912. – 26 студз. (№ 4); Наша ніва. – 1913. – 10 студз. (№ 2); Наша ніва. – 1913. – 18 студз. (№ 3); Наша ніва. – 1913. – 25 студз. (№ 4); Наша ніва. – 1913. – 1 лют. (№ 5); Наша ніва. – 1913. – 20 лют. (№ 8).
8. Програма Беларускаго Спэктакля у Полацку // Наша ніва. – 1910. – 23 верас. (№ 39). – С. 607.
9. Сусед. Расьце сьвядомасьць : [З Беларусі і Літвы] / Сусед // Наша ніва. – 1913. – 15 крас. (№ 15). – С. 3.
10. Явар, В. З гуты Залесься : [З Беларусі і Літвы] / В. Явар // Наша ніва. – 1912. – 30 жн. (№ 35). – С. 4.
11. Янка з пад Заберэжа. Заберэзь. Віл. губ. Ашмян. пав. : [З Беларусі і Літвы] / Янка з-пад Заберэжа // Наша ніва. – 1911. – 2 чэрв. (№ 22). – С. 287.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ